УДК 391.6:677

Юрчанка М. А., Савіцкая І. У.

## РУЧНІКІ – ІЛЬНЯНЫЯ КРЫЛЫ

*Навуковы кіраўнік: Савіцкая І.У., канд. філал. навук, дацэнт*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**

Артыкул прысвечаны апісанню аднаго з прадметаў народнага мастацтва – ручніка. Выяўлены розныя яго віды ў залежнасці ад выкарыстання, паказаны асаблівасці вырабу і ўпрыгожвання, а таксама сімвалізм узораў.

**Ключавыя словы:** народнае мастацтва, народная культура, ручнік, ткацтва, узор, вышыўка, сімвал

Yurchenko M. A., Savitskaya I. V.

## TOWELS – LINEN WINGS

*Scientific Supervisor: Savitskaya I.V., Associate Professor,*
*Candidate of Sciences in Philology*
*Belarusian National Technical University*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**

The article is devoted to the description of one of the objects of folk art – towels. Its various types are revealed depending on the use, the peculiarities of manufacturing and decoration, as well as the symbolism of patterns are shown.

**Keywords:** folk art, folk culture, towel, weaving, pattern, embroidery, symbol.

Надзвычай высокі статус ручніка ў беларускай культуры зусім невыпадковы. Менавіта ў ручніку сабраны працоўны, духоўны і душэўны патэнцыял народа і, безумоўна, сям’і і роду. Для таго, каб

пакласці ў куфэрак сувой палатна, неабходна было ўзараць поле, пасеяць лён, узгадаваць яго, выбраць, вымачыць, высушыць, зрабіць кудзелю, напрасці нітак, замацаваць іх на кроснах і, дачакаўшыся адпаведнага часу, распачаць таямнічае цудадзейства – упрыгожванне ручніка.

Без даматканага ільнянога ручніка немагчыма ўявіць паўсядзённы побыт, цяжкую працу, а таксама гуллівую святочную ўрачыстасць нашых продкаў. Ручнік суправаджаў беларусаў з дзяцінства і да самага заканчэння жыцця. Уласна кажучы, ён быў сімвалам зямнога існавання чалавека – ад моманту нараджэння і да моманту апускання труны ў магілу.

У значныя моманты жыцця нашы продкі выкарыстоўвалі розныя віды ручнікоў у залежнасці ад іх прызначэння і моманту звароту [1]. Самы просты быў з чалавекам ад раніцы да вечара. Ён прызначаўся для выцірання твару і рук, таму і называўся “ўціральнік”. Яго не аздаблялі ўзорамі ці складаным арнаментам. Наадварот, самым значным у хаце быў “набожнік”, якім прыбіралі “чырвоны кут”. Прызначаўся ён для пакрывання святых абразоў: Багародзіцы, Іісуса Хрыста ці святых заступнікаў сям’і. Яго расшывалі багатым арнаментам, поўным глыбокага сімвалізму.

У момант нараджэння дзіцяці выкарыстоўваўся ручнік, аздоблены стылізаванай выявай маці або дзіцяці з маці. Размяшчала яго павітуха ў галаве парадзіхі, каб забяспечыць з’яўленне здаровага маленькага. Немаўлятка адразу пасля з’яўлення на свет спавівалі ў ручнічок і клалі на стол, быццам прывязваючы яго да сакральнага для сялянскай сям’і месца.

Выкарыстоўваліся ручнікі і ў час вяселля: яны дараваліся гасцям, павязваліся сватам, клаліся на падлогу падчас вянчання, на ім падносілі каравай, ім жа павязвалі маладую і абводзілі тройчы вакол стала ў бацькоўскай хаце, бласлаўляючы яе на шлюб. Яго беражліва захоўвалі ўсё жыццё, каб не згубіць дабрабыт і сваё сямейнае шчасце.

Тэхналогія вытворчасці ручнікоў была вельмі цяжкая. Ніткі для ткацтва вырабляліся з ільну. Спачатку лён трэба было сабраць, потым вымачыць, высушыць, а потым ужо вырабляць ніткі.

Шырыня яго звычайна была ад дваццаці пяці да сарака пяці сантыметраў, даўжыня – ад аднаго да трох метраў. Ручнікі ткалі на кроснах (ткацтва на кроснах пашырылася на Беларусі ў XII–XIII стст.) з адбеленых або неадбеленых нітак, аздаблялі карункамі

расліннага і геаметрычнага арнаменту, вязанымі кручком, пазней – фабрычнымі карункамі. Па краях іх часта аздаблялі малінавымі ці чырвонымі стужкамі. Загадкавыя чырвона-белыя фігуркі, сіне-зялёныя, фіялетавыя, жоўтыя кветкі і птушкі на белым палатне зачароўваюць дзіцячыя сэрцы і вока сталага чалавека і сёння.

На Гомельшчыне і Віцебшчыне ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя бытавала вы́барнае ткацтва. У народзе яго звычайна называюць перабіраннем. Для выбарных тканін характэрны рэльефны геаметрычны арнамент, утвораны насцілам узорнага ўтоку на фонавае палатно. Аднак у выбарным ткацтве ўзорны ўток закладаецца не па ўсёй шырыні тканіны, а асобнымі ўчасткамі (выбарна), што дае магчымасць больш свабодна кампанаваць элементы і рабіць больш разнастайнай іх колеравую гаму. Віцебскія ручнікі ткалі з выкарыстаннем чырвоных, зялёных, сініх, жоўтых, чорных нітак; для тканін Гомельшчыны характэрна спалучэнне белага, чырвонага і чорнага колераў [3].

Важнае месца ў аздабленні беларускага ручніка належыць вышыўцы, не менш багатай па спосабах выканання і выкарыстання разнастайнасці ўзораў, чым ткацтва. Вышыўка была выключна ручным працэсам, які патрабаваў ад выканаўцаў уседлівасці, цярпення, пэўных навыкаў і нават таленту.

Арнамент ручнікоў адрозніваецца багаццем і разнастайнасцю. Узоры рабілі звычайнымі або спецыяльнымі іголкамі, часам кручком, а матэрыялам служылі ільняныя, баваўняныя, ваўняныя, зрэдку шаўковыя ніткі, бліскаўкі і інш.

Для накладной вышыўкі (аплікацыі) ужываліся шнур, тасьма, стужкі, кавалкі каляровых тканін, скура і інш. Вышыўкай, акрамя ручнікоў, аздаблялі жаночае адзенне (кашулі, галаўныя ўборы, фартухі, спадніцы, гарсеты) і мужчынскае (кашулі, шыйныя хусткі), рэчы дэкаратыўна-абрадавага і бытавога прызначэння (абрусы, навалочкі, посцілкі і інш.).

Тэхніка выканання народнай вышыўкі даволі разнастайная. Большасць швоў ужывалася выключна для ўпрыгожвання асновы. Існавала група традыцыйных дэкаратыўных швоў, злучальных і краявых швоў (абкіданне). На Палессі і Падняпроўі здаўна выкарыстоўвалі розныя віды зборак (маршчэнне). У залежнасці ад тэхнікі выканання вылучаюць дзве групы швоў: верхашвы (па суцэльнай тканіне) і скразныя (для іх выцягваецца пэўная колькасць

нітак асновы). Верхашвы падзяляюцца на лікавыя (выконваюцца па ліку нітак тканіны) і адвольныя (па контуры) [2].

Сярод лікавых швоў асобнае месца займае набор (нацяг, завалаканне і інш.); пашыраны таксама швы крыжыкам, пляцёнка, сцябліністае шво, а таксама розныя віды процягу (гладзі) і інш. Традыцыйныя верхашвы выконваліся чырвонымі або чырвонымі з нязначным дадаткам сініх (з канца XIX ст. чорных) нітак. Адвольныя швы – процяг, аплікацыя, выбіванне і інш. – найчасцей выкарыстоўваліся для стварэння паліхромных стылізавана-раслінных узораў. Строчка – вышыўка па разрэджанай тканіне – сустракаецца пераважна ў форме вузкіх мярэжак, якімі ўпрыгожвалі кашулі, фартухі, наміткі, ручнікі [2].

Арнаменты на ручніку – гэта не проста выпадковыя наборы пэўных прадметаў або рысак. Кожны ўзор – гэта пэўны сімвал, які можна прачытаць і сёння [4]. Так, напрыклад, нашы продкі-славяне спрадвеку шанавалі Сонца і Зямлю-карміцельку, лічылі, што ад іх залежыць жыццё. Бацька-Сонца і Маці-Зямля даюць людзям усё: хлеб і ваду, цяпло і святло, рэчкі і азёры, палі і лясы. У старыя часы да Сонца як да бога звярталіся па дапамогу. Адсюль на ручніках часта выкарыстоўваўся вобраз сонца: ён мае выгляд ромба з промнямі ў бакі. Вобраз зямлі набыў выгляд ромба, запоўненага маленькімі квадрацікамі ці ромбікамі. Гэта нібыта зярняты, роўна засеяныя на полі дбайнай рукой селяніна.

Сімвалы зямлі і сонца з’яўляюцца аднымі з самых старажытных узораў; з даўніх часоў яны лічыліся цудадзейнымі, бо засцерагалі, па павер’ях, ад усяго дрэннага. Таму такія ўзоры вышывалі абавязкова на ручніках, на адзенні.

У семантыцы вышыўкі распаўсюджаны разнастайныя выявы птушак. Трэба адзначыць, што ў старажытнабеларускім народным мастацтве вобраз птушкі адносіцца да найбольш аблюбаваных, паколькі птушка – гэта традыцыйны сімвал святла, сонца, кахання. Зафіксавава значная колькасць разнастайных па іканаграфіі кампазіцый, кожная з якіх характарызуецца пэўнымі семантычнымі значэннямі. Напрыклад, зязюля сімвалізавала жанчыну-ўдаву, салавей з’яўляўся паэтам кахання, сокал увасабляў каханага, а арол – героя. Голуб жа выступаў як сімвал кахання і міру. На ручніках два галубы, павернутыя галовамі адзін да аднаго, – гэта сімвал кахання. Нездарма шлюбныя ручнікі былі ўпрыгожаны гэтымі птушкамі,

прычым паміж імі часта вышывалі кветкі, што сімвалізавала каханне ў самым росквіце.

Даволі распаўсюджанай была выява хвалепадобнай галінкі, ад якой адыходзілі ўверх і ўніз сіметрычныя завіткі. Гэтая галінка ідэйна была звязана, магчыма, са старажытнымі сімваламі вады і напоенай ёю раслiннасцю.

Спакон вякоў з вялікай павагай ставіліся да хлеба, да зерня. Калі кавалачак хлеба падаў на падлогу, яго паднімалі і шчыра прасілі прабачэння. Хлеб ніколі не выкідалі, не раскідалі, не пакідалі на пустым стале. У народзе здаўна кажуць: "Зерне святое", "Хто любіць зерне, той будзе багаты і шчаслівы", "Зерне мае вялікую сілу". Адсюль узоры з сімвалам зерня таксама былі неад'емнай часткай тканых і вышываных ручнікоў.

Берагіня – гэта важны знак, які сустракаецца ў шматлікіх арнаментах. Яе стварыў народ загадкавай, шматаблічнай і магутнай кветкай, што сімвалізуе матчыну сілу. Яна – сама Маці-прырода, якая ўяўляе сабой стварэнне і абарону свету, а таксама вечнае абнаўленне і гармонію жыцця.

Безумоўна, беларускі ручнік адносіцца да тых прадметаў мастацтва, якія належаць і мінуламу, і сучаснасці. Папулярнасць яго нязменная. У вёсках і сёння ручнік абавязкова прысутнічае ў найбольш важныя, пераломныя этапы жыцця чалавека; без яго не абыходзіцца зараз ніводная больш-менш значная выстава народнага мастацтва, бо менавіта ручнік з найбольшай яскравасцю ўвасабляе нацыянальныя рысы арнаментальнага мастацтва, высокае майстэрства ткацтва і вышыўкі.

Шмат стагоддзяў карыстаюцца беларусы ручніком. Ткуць і расшываюць яго і сёння, працягваючы ўдасканальваць прыгажосць, над якой працавала мноства папярэдніх пакаленняў. Кожнае з іх, спасцігаючы законы аздаблення тканіны, асэнсоўвала і складала ў адзіную скарбонку разуменне ручніковага дэкору і яго асаблівасцей, тэхнічных прыёмаў, найлепшых каляровых спалучэнняў. З цягам часу адточваліся характэрныя адзнакі традыцыйнага аздаблення беларускага ручніка, фарміраваўся канон, у рамках якога праходзілі далейшыя творчыя пошукі. Канон гэты, між іншым, ніколі не абмяжоўваў ткачыху, вышывальшчыцу, а дазваляў і нават прапаноўваў увасабляць у ім свой характар, пачуцці, настрой, сваё адчуванне хараства, дэманстраваць рамесніцкую дасканаласць.

Праходзяць гады, мяняюцца густы, на змену чалавечым рукам прыходзяць машыны, створаныя тымі ж рукамі. Але пакуль побач з чалавекам будзе жыць пачуццё прыгожага, імкненне да натуральнага, сапраўднага, будзе жыць і ручнік.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Дубініч, А. І. Беларускі ручнік: з мінулага ў дзень сённяшні / А.І. Дубініч. – Нясвіж: Нясвіжская друкарня, 2016. – 34 с.
2. Памазенка, Т. Повязь часоў – беларускі ручнік / Т. Памазенка, Г. Ваўчок // Роднае слова. – 2011. – № 7. – С. 77–79.
3. Фадзеева, В. Я. Беларуская народная вышыўка / В. Я. Фадзеева. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 199 с.
4. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / Рэд. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1989. – 575 с.